# Права

Ю. П. БРОЎКА

## БЕЛАРУСКАЯ ССР — АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛЬНІК МІЖНАРОДНАГА ПРАВАТВОРЧАГА ПРАЦЭСУ

Міжнароднае права ў цяперашні час перажывае перыяд актыўнага ўдасканальвання. Паспяхова развіваецца працэс міжнароднай праватворчасці, які ўключае ў сябе прагрэсіўнае развіццё і кадыфікацыю як асноўных імператыўных міжнародна-прававых прынцыпаў, так і практычна ўсіх галін і інстытутаў міжнароднага права. Вядучая роля ў гэтым рэвалюцыйным пераўтваральным працэсе належыць Савецкаму Саюзу і краінам сацыялістычнай садружнасці. «Мы прапануем усяму свету, — адзначаў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў у сваім дакладзе на чацвёртай сесіі Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання, — у тым ліку свету капіталістычных дзяржаў, шырокую, даўгачасную, усебаковую праграму ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, якая ўлічвае тыя новыя магчымасці, якія адкрывае перад чалавецтвам эра навукова-тэхнічнай рэвалюцыі»[1].

Значны ўклад у рознабаковае міжнароднае супрацоўніцтва, а таксама і ў справу кадыфікацыі і прагрэсіўнага развіцця міжнароднага права, уносяць асобныя савецкія сацыялістычныя рэспублікі — суверэнныя ўдзельнікі міжнародных зносін, у тым ліку і Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Беларуская ССР удзельнічае ў рабоце розных дыпламатычных канферэнцый, з'яўляецца членам многіх міжнародных арганізацый, мае вялікую дагаворную практыку.

Уплыў Беларускай ССР на прагрэсіўнае развіццё і кадыфікацыю міжнароднага права ажыццяўляецца як ў парадку садзейнічання праватворчай дзейнасці Саюза ССР, так і непасрэдна ў выпадках, калі рэспубліка лічыць магчымым узяць на сябе пэўныя міжнародныя абавязацельствы.

Непасрэдны ўдзел Беларускай ССР у працэсе кадыфікацыі і прагрэсіўнага развіцця міжнароднага права ажыццяўляецца ў ходзе дыпламатычных кансультацый і перагавораў з прадстаўнікамі розных краін, якія праводзяцца як на двухбаковай, так і на многабаковай аснове. Вялікае значэнне мае ўдзел прадстаўнікоў БССР у праватворчай дзейнасці, што праводзіцца ў рамках устаноў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Прадстаўнікі БССР актыўна ўдзельнічаюць у вызначэнні галоўных напрамкаў міжнароднай праватворчай дзейнасці, у тлумачэнні і развіцці асноўных прынцыпаў Устава ААН, на якіх грунтуецца сучаснае міжнароднае права. Дыпламаты Беларускай ССР плённа працуюць над састаўленнем праектаў міжнародных актаў, якія павінны адыграць істотную ролю ў справе кадыфікацыі і прагрэсіўнага развіцця міжнароднага права.

Прадстаўнікі БССР выказваюць розныя меркаванні па праблемах міжнароднага права ў ходзе дыскусій у Генеральнай Асамблеі і іншых органах ААН. Яны ўдзельнічаюць у стварэнні розных спецыяльных органаў ААН, якія прызначаны займацца кадыфікацыйнай работай. Прадстаўнікі БССР удзельнічаюць і ў фарміраванні важнага і кампетэнтнага праватворчага органа — Камісіі міжнароднага права ААН.

Значны ўклад у справу міжнароднай праватворчасці быў унесены дыпламатамі Беларускай ССР у такіх органах, як Камісія па правах чалавека, Камісія па правах жанчын і інш. Беларусь мае магчымасць паста-

янна сачыць за работай усіх дапаможных і спецыяльных органаў ААН, дае ў неабходных выпадках ацэнку іх дзейнасці на пасяджэннях Генеральнай Асамблеі ААН і іншых галоўных органаў сусветнай арганізацыі.

Беларуская ССР, як і другія суверэнныя дзяржавы, у ходзе распрацоўкі канвенцый выражае адносіны да іх сваім удзелам у разглядзе пытання аб зацвярджэнні тэкста канвенцыі ў Генеральнай Асамблеі ААН ці на спецыяльна сазванай канферэнцыі паўнамоцных прадстаўнікоў, а таксама сваім суверэнным волевыяўленнем, якое выражаецца ў падпісанні канвенцыі і яе далейшай ратыфікацыі.

Кожнай стадыі дзейнасці беларускай дыпламатыі ў працэсе кадыфікацыі і прагрэсіўнага развіцця асобных галін і інстытутаў міжнароднага права ўласцівы свае асаблівасці. Аднак ёсць пэўныя моманты, якія характэрны для ўсёй кадыфікацыйнай дзейнасці рэспублікі ў цэлым. У ходзе кадыфікацыйнай работы дыпламаты БССР нараўне з дыпламатамі СССР і іншых сацыялістычных краін нязменна займаюць прынцыповую ленінскую пазіцыю, імкнуцца знайсці аптымальныя рашэнні па найбольш складаных і спрэчных пытаннях міжнароднага права.

Прадстаўнікі БССР нязменна выступаюць за безумоўнае правядзенне ў жыццё прынцыпа універсальнасці агульных міжнародных дагавораў, зыходзячы з таго, што прынцып універсальнасці павінен асабліва старанна праводзіцца ў жыццё ў тых выпадках, калі размова ідзе пра разработку канвенцый, якія кадыфіцыруюць прынцыпы і нормы агульнага міжнароднага права [2].

Беларуская ССР зыходзіць таксама з таго, што любая дзяржава — удзельнік агульнага міжнароднага дагавора — мае права як у момант падпісання, так і пры далейшай ратыфікацыі зрабіць агаворку, якая не супярэчыла б мэце дагавора і яго асноўным прынцыпам. Такія агаворкі не павінны закранаць цэласнасці агульнага пагаднення дзяржаў, а ствараць у яго рамках шэраг дадатковых дагаворных сістэм [3]. Яшчэ 12 студзеня 1952 года БССР падтрымала рэзалюцыю Генеральнай Асамблеі ААН, у сілу якой Генеральнаму сакратару ААН прапаноўвалася пры ажыццяўленні ім функцыі дэпазітарыя многабаковых міжнародных дагавораў зыходзіць з прынцыповай дапушчальнасці агаворак, якія не закранаюць сутнасці дагавора [4].

Прадстаўнікі Савецкай Беларусі неаднаразова выказваліся супраць уключэння ва ўніверсальныя міжнародныя дагаворы палажэнняў, якія ўстанаўлівалі б абавязковую для іх удзельнікаў юрысдыкцыю Міжнароднага Суда ААН па спрэчках, звязаных з тлумачэннем ці імплементацыяй гэтага дагавора.

Такое разуменне ролі Міжнароднага Суда ААН цалкам супадае з сутнасцю яго Статута. Паколькі Беларуская ССР, як і большасць краін, устрымалася ад дэпаніравання Генеральнаму сакратару ААН заявы аб прызнанні для сябе абавязковай юрысдыкцыі Міжнароднага Суда па тых ці іншых справах, спрэчка з удзелам БССР у якасці аднаго з бакоў можа разглядацца ў Міжнародным Судзе толькі пры наяўнасці яе дастаткова акрэсленай згоды ў кожным асобным выпадку.

Такім чынам, Беларуская ССР робіць свой уклад у працэс міжнароднай праватворчасці, садзейнічае прагрэсіўнаму развіццю асноўных прынцыпаў сучаснага міжнароднага права, якое забяспечвае іх інтэрпрэтацыю і канкрэтызацыю з улікам зменлівых патрабаванняў міжнароднага жыцця.

[1] Звязда. 1985. 28 лістап.

[2] Документы ООН A/C. 6/SR. 1149. П. 26.

[3] Талалаев А. Н. Международные договоры в современном мире. М., 1973. С. 81—82.

[4] Объединенные Нации. Официальные отчеты Генеральной Ассамблеи. Пятая сессия. Шестой комитет. Правовые вопросы. Нью-Йорк, 1953. С. 68.